Мая Радзіма – Беларусь

выканаў Пушкароў Аляксей, вучань ", 5 "Г" клас,
ДУА "Гімназія №4 г. Магілёва

Магілёў! Горад любімы.
Маленькі куточак вялікай Радзімы.
З табой мае вёсны, з табой мае зімы...

Год першы…
19 снежня 2012 года ў радзільным доме горада Магілёва нарадзіўся хлопчык. Гэта быў я. Калі мне споўніцца чатырнаццаць гадоў, я атрымаю пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, у якім будзе запіс аб маім месцы нараджэння – горад Магілёў.
Год другі…
Памяць яшчэ нічога не ўзгадвае. Але бацькі паказваюць дамашнюю фільматэку, фотаздымкі. А там такая прыгажосць! Цудоўна цвіце наш дачны сад, вакол яркія кветкі. Яшчэ жывы мой дзядуля і нават прадзядуля. Бачна, як радуюцца мае блізкія, што я побач з імі. І я павінен не падвесці іх, стаць дастойным грамадзянінам, дасягнуць нечага высокага, зрабіць нешта добрае, каб і мой след застаўся ў гісторыі сям’і і краіны.
Год трэці…
Шмат што памятаю: дзіцячы сад, бацька, маці, бабулі… Прыгажуня навагодняя ёлка на бульвары,  ледзяныя горкі, гірлянды. А вясной мы едзем на дачу. Уздоўж дарогі, на дрэвах, дамах, слупах многа бусліных гнёздаў. Упершыню бачу гэту цудоўную птушку – бусла. Мы едзем, а яна зусім нізка ляціць над намі, быццам плыве як зачараваная. Яна такая вялікая і незвычайна прыгожая, спакойная і паважная, як наша краіна. Нездарма бусел – сімвал Беларусі.
Год чацвёрты…
Кожнае лета прыносіць свае падарункі, сюрпрызы. Я хачу больш ведаць пра тое, што і хто побач са мной. Мы едзем у заасад. Як усё цікава! Вялікі дзякуй тым людзям, хто стварыў усё гэта, хто клапоціцца пра жывёл і птушак. Наш Магілёўскі заасад вельмі багаты разнастайнымі насельнікамі. Але і дзікая прырода маёй Радзімы здзіўляе сваімі прадстаўнікамі. Аднойчы вечарам на дачы тата паклікаў мяне на вуліцу. Да нас у госці прыйшоў вожык. Мы паілі яго малачком і доўга любаваліся. А яшчэ бачыў я лятучых мышэй (кажаноў). Яны лётаюць вакол нашага дома і, здаецца нам, жывуць недзе пад страхой. Тата сказаў: «Гэта нашы суседзі, іх трэба паважаць».
Год пяты…
Вельмі цікава назіраць за працай будаўнікоў. Колькі прыгожых будынкаў вырастае на нашай вуліцы! Якая магутная тэхніка працуе! Мяне ўжо цікавіць усё. Хачу быць экскаватаршчыкам, трактарыстам, бульдазерыстам…
Мы з бабуляй ідзём на праспект Шмідта, дзе знаходзіцца мемарыял «Брацкія могілкі», гарыць Вечны агонь. Бабуля расказвае, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны тут быў адзін з самых страшных канцлагераў – Лупалаўскі. У ім загінула сорак тысяч вязняў. Бабуля плача, мы кладзём кветкі і моўчкі

стаім ля Вечнага агню. Ідзём дамоў, а я ўсё задаю і задаю пытанні… Іх многа, напэўна, хопіць на ўсё жыццё…
Год шосты…
Я раблю новыя адкрыцці. Побач з нашай вуліцай, на дачы, праходзіць чыгунка. Вялізныя таварныя цягнікі грукаюць і грукаюць, імгненна праносяцца пасажырскія прыгажуны. Тата расказвае, што яны імчаць на поўдзень. Там знаходзіцца яшчэ адзін абласны цэнтр Беларусі – Гомель. А многія едуць у другія краіны.
Год сёмы…
Я ўжо сам чытаю, пішу. Рыхтуюся ісці ў школу. Аднойчы, перад святам Перамогі, мы наведалі Буйніцкае поле. Горад помніць і шануе памяць тых герояў, што загінулі тут у сорак першым годзе. Іх імёнамі названы вуліцы горада, дзяржаўныя ўстановы. Яны для нас з’яўляюцца прыкладам адданасці сваёй Радзіме.
Год восьмы…
У верасні пачалося маё школьнае жыццё. Хачу ведаць усё важнае. Падабаецца з бацькамі падарожнічаць у іншыя краіны. Заўсёды здзіўляе момант, калі ўсе пасажыры дружнымі апладысментамі выказваюць падзяку экіпажу самалёта Белавія – «Васілёк», які прызямліўся на роднай зямлі. Радзіма – самае дарагое, што ёсць у чалавека.
Год дзявяты…
Шмат чаго адбываецца ў гэтым годзе ў горадзе, але галоўная падзея – святкаванне 80-годдзя абароны Магілёва ад фашысцкіх захопнікаў. На беразе Дняпра ладзіцца рэканструкцыя гэтай падзеі. Мая мама ўдзельнічае ў гэтым мерапрыемстве. Мы з татам позна ўвечары ідзём глядзець, як гэта адбывалася. Усё ўражвае, асабліва прыгожа рассыпаецца ў чэрвеньскім небе святочны салют. Салют вечнай памяці героям.
Год дзясяты…
Летам мы ездзілі на радзіму бабулі ў Брэст. Адразу за Мінскам нас сустракае вялізны макет Белавежскага зубра. Зубр – яшчэ адзін сімвал Беларусі.
Год адзінаццаты…
І зноў падарунак гораду! Новая кальцавая дарога. Якая прыгажосць! З’язджаем з трасы, сустракаем маладзенькіх касуль. «Суседзяў прыбаўляецца. Будзем сябраваць», – кажа тата. Гасціннасць і сапраўднае сяброўства – характэрная асаблівасць беларусаў.
Мне пайшоў дванаццаты год…